# *Старажытнейшая, самая славянская, мова беларуская мая*

Роднае матчына слова!
Не забыць мне цябе, не згубіць.
Ты, як водар, напоены хлебам,
Ты, як птушка, што ў небе ляціць.
Не пачуўшы цябе, паміраю.
А пачуўшы, ускрэсну ізноў.
Як матулю, цябе я кахаю,
Да цябе не пагасне любоў!
І ліецца ад краю да краю
Мова нашых бацькоў і дзядоў.
І таму я ўсім наракаю:
Не згубіце вы матчыных слоў!

Надзея Шылавец




**84(4Беи)**
**М349**
**Матчына слова [Текст] : кніга пра беларускую мову / [прадм. Ніла Гілевіча ; уклад. Уладзіміра Паўлава]. - Мінск : Мастац. літ., 1991. - 335 с.**

***«Не только живет человек хлебом..., но наиболее словом»,— сказал великий сын нашего народа Франциск Скарина. Но не так уж и много найдется народов, у слова которых была бы такая трагическая судьба. И все же была у нашего народа с его «самым гармоническим...» (Адам Мицкевич) языком великая вера, без которой он, говоря словами Достоевского, «не спас бы себя никогда».***
***В этой книге собраны произведения самых разных жанров, в которых — и этот трагизм, и наша святая вера в свое слово, в его бессмертие.***




**83.3(4Беи)**
**Л889**
**Лыч, Леанід Міхайлавіч.**
**Беларуская нацыя і мова [Текст] : літаратурна-гістарычныя артыкулы / Леанід Лыч. - Мінск : Мастац. літ., 1994. - 277 с.**

***Кніга «Беларуская нацыя і мова», аўтарам якой з'яўляецца доктар гістарычных навук Леанід Лыч, — хвалюючы сказ пра тое, як у неспрыяльных умовах нашы далёкія продкі не выракаліся сваіх каранёў, захавалі мову, культуру, побыт і звычкі, чым заслужылі вялікую пашану ў сваіх нашчадкаў, далі ім добры прыклад таго, як патрэбна шанаваць, адстойваць бацькоўскія традыцыі.***




**83.3(4Беи)**
**Б43**
**Беларусіка=Albaruthenica [Текст]. - Мінск : Навука і тэхніка, 1993 - 1995.**
**Кн. 1 / рэд. А. Мальдзіс [і інш.] ; Міжнародная асацыяцыя беларусістаў. Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францішка Скарыны. - 1993. - 350 с.**

***У выданні шырока прадстаўлены матэрыялы Міжнароднага кангрэсу беларусістаў, які адбыўся ў Мінску 25—27 мая 1991 г., і Міжнароднай навуковай сесіі, праведзенай Акадэміяй навук Беларусі да 500-годдзя з часу нараджэння Ф. Скарыны. Аўтары выдання — вядучыя беларускія і зарубежныя гісторыкі, літаратуразнаўцы, мовазнаўцы, мастацтвазнаўцы. Іх працы прысвечаны адраджэнню беларускай нацыянальнай свядомасці, вяртанню мастацка-духоўнай спадчыны, пашырэнню беларускай культуры ў свеце. Разлічана як на даследчыкаў-беларусазнаўцаў (у тым ліку і зарубежных), так і на шырокага чытача, усіх тых, каму блізкая і дарагая беларуская культура.***




**84(4Беи)**
**Г47**
**Гілевіч, Ніл Сяменавіч.**
**Любоў прасветлая [Текст] : роздумы ў вершах і прозе аб роднай мове : лірыка-публіцыстычная хроніка, 1947- 1995 / Ніл Гілевіч. - Мінск : Навука і тэхніка, 1996. - 544 с.**

***Кніга народнага паэта Беларусі, заслужанага дзеяча навукі, прафесара Н. С. Гілевіча пісалася амаль паўстагоддзя. Яна не толькі ярка выяўляе яго сыноўнюю любоў да роднай мовы, яго грамадзянскую заклапочанасць яе лёсам. У кнізе — назіранні, думкі і высновы аўтара па такіх праблемах, як мова і дзяржава, мова і гістарычны лёс народа, мова і асоба чалавека, мова і нацыяльная культура, мова і школа, мова гутарковая і літаратурная, мова як рабочы інструмент пісьменніка і інш. Разлічана на шырокае кола чытачоў.***




**63.3(4Беи)**
**Д798**

**Дубянецкі, Эдуард Станіслававіч.**
**Асветнікі Беларусі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына [Текст] / Эдуард Дубянецкі. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. - 71, [1] с. : іл. - (Ганаруся табой, Беларусь).**

***У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную асветніцкую дзейнасць хрысціянскай падзвіжніцы, ігумені манастыра Святога Спаса ў Полацку Ефрасінні Полацкай, багаслова, царкоўнага пісьменніка, епіскапа Кірылы Тураўскага і беларускага, усходнеславянскага першадрукара, культурнага дзеяча, мысліцеля-гуманіста Францыска Скарыны. Кніга прызначана для навучэнцаў і выкладчыкаў навучальных устаноў нашай краіны, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай беларускага народа.***




**63.3(4Беи)**
**Д798**
**Дубянецкі, Эдуард Станіслававіч.**
**Асветнікі Беларусі: Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іпацій Пацей [Текст] / Эдуард Дубянецкі. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. - 71 с. : іл. - (Ганаруся табой, Беларусь).**

***У кнізе ў папулярнай форме распавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную асветніцкую дзейнасць трох хрысціянскіх асветнікаў 16—17 стагоддзяў, якія, нягледзячы на розніцу ў рэлігійных і філасофскіх поглядах, унеслі значны ўклад у развіццё пісьменнасці і кніжных ведаў на беларускіх землях – пратэстанцкіх дзеячаў, друкароў Сымона Буднага (каля 1530—1593) і Васіля Цяпінскага (каля 1540 — каля 1603) і ўніяцкага царкоўнага дзеяча і пісьменніка Іпація Пацея (каля 1541 — каля 1613). Кніга прызначана для навучэнцаў і выкладчыкаў, а таксама для ўсіх, хто***




**83.3(4Беи)**
**Б481**
**Бергман, Аляксандра.**
**Слова пра Браніслава Тарашкевіча [Текст] : гістарычны жыццяпіс / А. Бергман ; пер. з пол. Я. Касцюка ; прадм. А. Ліса. - Мінск : Мастац. літ., 1996. - 192 с. : іл.**

***Манаграфія Аляксандры Бергман прысвечана выдатнаму беларускаму палітыку, мовазнаўцу і перакладчыку Браніславу Тарашкевічу. Грунтуючыся на шматлікіх архіўных матэрыялах, успамінах і сведчаннях сучаснікаў, польская даследчыца асвяціла складаны жыццяпіс Тарашкевіча, які, як і безліч іншых беларускіх дзеячаў, знік у прадоннях ГУЛАГу.***




**83.3(4Беи)**
**С185**
**Саннікава, Ала Уладзіміраўна.**
**Цётка (Алаіза Пашкевіч) - аўтар першых вучэбных дапаможнікаў на беларускай мове [Текст] : вучэб.-метад. дапаможнік / А. У. Саннікава ; Бел. дзярж. мед. ун-т, Каф. беларус. і рус. моў. - Мінск : БДМУ, 2003. - 64, [3] с.**

***У рабоце адлюстравана дзейнасць вядомай беларускай паэткі Алаізы Пашкевіч (Цёткі) у галіне асветы і адукацыі, яе праца па стварэнні беларускіх школ, напісанні першых дапаможнікаў для пачатковай школы — «Беларускага лемантара», «Першага чытання для дзетак беларусаў». Вучэбна-метадычны дапаможнік прызначаны для студэнтаў, якія вывучаюць беларускую мову і гісторыю Беларусі.***




**83.3(4Беи)**
**К92**
**Купала і Колас, вы нас гадавалі [Текст] : дакументы і матэрыялы : у 2 кн. / уклад.: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан ; [рэдкал.: М. І. Мушынскі (гал. рэд.) і інш.] ; Дэпартамент па архівах і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. архіў Рэсп. Беларусь, Федэральнае архіўнае агенцтва Расіі, Расійскі дзярж. архіў літ. і мастацтва. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010 - 2012.**

***Публікуюцца невядомыя дакументы, у тым ліку аўтографы класікаў, матэрыялы біяграфічнага характару, сведчанні пра грамадскае і літаратурнае акружэнне песняроў, увекавечанне іх памяці. Аснову зборніка складаюць дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Расійскага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва.***




**84(4Беи)**
**Г47**
**Гілевіч, Ніл Сымонавіч.**
**Выбраныя творы [Текст] : у 2-х т. / Ніл Гілевіч. - Мінск : Мастац. літ., 1991.**
**Т. 1 : Вершы, паэмы, п'есы. - 1991. - 478 с.**

***В двухтомник избранных произведений народного поэта Беларуси включены лучшие произведения, написанные им за сорок лет творческой деятельности.***

***В первый том вошли стихи, поэмы и пьесы.***




**83.3(4Беи)**
**К92**
**Янка Купала. Для тых, якіх люблю [Текст] : успаміны, эсэ, вершы, паэмы, п'еса : [да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы / уклад. В. Шніпа ; мастак У. Свентахоўскі]. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. - 317, [1] с. : іл.**

***У кнігу ўвайшлі ўспаміны і эсэ пра Песняра беларускай зямлі Янку Купалу, напісаныя ягонымі сучаснікамі і даследчыкамі літаратуры, а таксама вядомыя творы класіка беларускай літаратуры. Кніга багата ілюстраваная і выдаецца ў падарункавым фармаце да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы.***




83.3(4Беи)
Б142

**Максім Багдановіч. Я не самотны… [Текст] : успаміны, артыкулы, вершы, пераклады : [да 125-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча / уклад. Віктар Шніп ; мастак Уладзімір Свентахоўскі]. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. - 334, [1] с. : іл.**

***У кнігу ўвайшлі ўспаміны і артыкулы пра генія беларускай зямлі Максіма Багдановіча, напісаныя ягонымі сучаснікамі, а таксама амаль усе паэтычныя творы паэта. Кніга багата ілюстраваная і выдаецца ў падарункавым фармаце да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.***